ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі універсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 12 (642) | Субота, 5 красавіка 1986 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

ПАЗЫЎНЫЯ «ЧЫРВОНАЙ СУБОТЫ»

## СТВОРАНЫ ШТАБ

У нашым універсітэце, як і ва ўсіх калектывах краіны, разгарнулася актыўная падрыхтоўка да Усесаюзнага камуністычнага суботніка, прысвечанага 116-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна. Гэта пытанне было абмеркавана пазаўчора на чарговым пасяджэнні партыйнага камітэта. Зацверджаны мерапрыемствы і штаб па падрыхтоўцы і правядзенню свята працы. У яго састаў увайшлі прадстаўнікі рэктарата, дэканатаў і грамадскіх арганізацый універсітэта. Штаб узначальвае прарэктар па завочнаму навучанню Л. Н. Сечка.

## НА РАХУНАК СУБОТНІКА

У кожным камуністычным суботніку, прысвечаным гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна, актыўны ўдзел прымаюць студэнты нашага універсітэта. Вялікі аб'ём работ на народнагаспадарчых аб'ектах і добраўпарадкаванні выканаюць яны сёлета. Першымі пачалі працаваць у лік камуністычнага суботніка студэнты фізічнага і біялагічнага факультэтаў. З мінулай суботы яны па графіку вядуць работы ў вольны ад заняткаў час на аб'ектах БУ № 46 будаўнічага трэста № 14 — паліклініцы № 8 і жылым доме па вуліцы Багданава.

(Наш кар.)

## НЕ! — ЯДЗЕРНАЙ ЗБРОІ

З вялікай увагай выслухаў выступленне Генеральнага сакратара ЦК КПСС М. С. Гарбачова па савецкім тэлебачанні. Яшчэ раз выказана рашучае жаданне пазбавіць свет ад пагрозы ядзернай вайны. Савецкі Саюз робіць усе захады для таго, каб ні ў адным рэгіёне свету не праводзіліся выпрабаванні ядзернай зброі. СССР першым аб'явіў мараторый на ядзерныя выпрабаванні і больш не пачне іх, калі гэтую ініцыятыву падтрымаюць ЗША і іншыя краіны Заходняй Еўропы. М. С. Гарбачоў выступіў з прапановай сесці за стол перагавораў з прэзідэнтам ЗША Р. Рэйганам у любы час і ў любой еўрапейскай краіне, каб дасягнуць пагаднення па пытаннях, якія цяпер асабліва востра хвалююць усё чалавецтва.

Мы, савецкія людзі, горача падтрымліваем міралюбівую знешнюю палітыку КПСС і Савецкага ўрада, адабраем новы крок да ажыццяўлення запаветнай мары прагрэсіўнага чалавецтва свету — поўнай забароны выпрабаванняў і паступовага знішчэння ўсіх запасаў ядзернай зброі.

**В. ЮФЕРАЎ,**
**асістэнт кафедры навуковага камунізму, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.**

## ПАКУЛЬ НЕ ПОЗНА

«Чалавецтва стаіць на рубяжы, які патрабуе гранічнай адказнасці. Вынікі ядзернай гонкі могуць стаць небяспечна непрадказальнымі. Трэба дзейнічаць разам». Гэтыя словы з выступлення Генеральнага сакратара ЦК КПСС таварыша М. С. Гарбачова па савецкім тэлебачанні асабліва запалі ў душу. Савецкі Саюз робіць усё для таго, каб на зямлі заўсёды быў трывалы мір, над чалавецтвам перастала вісець ядзерная пагроза. У аднабаковым парадку ён аб'явіў мараторый на ядзерныя выпрабаванні і цвёрда трымаў дадзенае абяцанне. Але, нягледзячы на прыклад СССР, настойлівыя патрабаванні і амерыканскага народа і народаў усяго свету, урад ЗША працягвае праводзіць ядзерныя выпрабаванні. Гэта не што іншае, як грэбаванне інтарэсамі ўсяго чалавецтва, жаданне трымаць яго ў страху перад заўтрашнім днём.

Пакуль яшчэ не позна, трэба спыніць небяспечны ход падзей, зрушыць з мёртвай кропкі ўвесь працэс ядзернага раззбраення. Як адзначыў М. С. Гарбачоў, Савецкі Саюз яшчэ раз дае амерыканскай адміністрацыі шанц прыняць адказнае рашэнне — спыніць ядзерныя выбухі.

**С. ДАШКЕВІЧ,**
**студэнт 2-га курса гісторыка-філалагічнага факультэта, слухач аддзялення журналістыкі факультэта грамадскіх прафесій.**

*ЗАЎТРА — ДЗЕНЬ ГЕОЛАГА*

## ПЯЦІГОДЦЫ ПАТРЭБНЫ РУДАЗНАЎЦЫ

**«Удзяліць асаблівую ўвагу пошукам і разведцы месцанараджэнняў высокаякасных руд для чорнай і каляровай металургіі, сыравіны для вытворчасці мінеральных угнаенняў і будаўнічых матэрыялаў, павелічэнню разведаных запасаў прэсных падземных вод».**

(З Асноўных напрамкаў эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1986—1990 гады і на перыяд да 2000 года).

Тэрмін «рудазнаўцы», які ўжываўся яшчэ ў часы М. В. Ламаносава, не страціў свайго значэння і ў наш час інтэнсіфікацыі і паскарэння развіцця эканомікі. Рудазнаўцы— гэта геолагі, выдатныя сучасныя спецыялісты ў галіне пошукаў, разведкі і вывучэння цвёрдых, вадкіх і газападобных карысных выкапняў. Народнай гаспадарцы ў роўнай ступені неабходны і руда, і нафта, і газ, і вада.

У матэрыялах XXVII з'езда КПСС разам са станоўчымі момантамі ў развіцці галін народнай гаспадаркі адзначаюцца і недахопы ў нафтавай і вуглездабываючай прамысловасці. Але няма папрокаў у адрас геолагаў-разведчыкаў, якія выканалі планы XI пяцігодкі па прырасту запасаў карысных выкапняў. І гэта прыемна ўсведамляць на прафесійнае свята — у Дзень геолага.

Падкрэслім толькі найбольш важкія дасягненні савецкіх геолагаў, гідрагеолагаў, геафізікаў. Значны ўклад у развіццё сельскай гаспадаркі і меліярацыі зямель унеслі гідрагеолагі. У цяперашні час поўнасцю задавальняецца патрэба праектных арганізацый у матэрыялах комплексных гідрагеалагічных і інжынерна-геалагічных здымак, а таксама ў галіне разведкі прэсных падземных вод для арашэння зямель, абвадненння пашаў, сельскагаспадарчага водазабеспячэння. Значна перавыкананы пяцігадовыя заданні па прырасту запасаў прыроднага газу, жалезных, марганцавых і храмітавых руд, нікеля, медзі і іншых карысных выкапняў, адкрыты новыя ўнікальныя месцанараджэнні нафты, газу, жалезных руд.

У XII пяцігодцы і ў перыяд да 2000 года геолагаразведачная служба краіны будзе вырашаць новыя важныя задачы па далейшаму ўмацаванню і пашырэнню мінеральна-сыравіннай базы. Будуць актывізаваны пошукавыя работы па стварэнню рэзерву месцанараджэнняў карысных выкапняў, прадугледжваецца інтэнсіфікацыя геолагаразведачнага працэсу, у тым ліку для рэалізацыі Харчовай праграмы СССР. Недалёка той час, калі будуць створаны новыя сыравінныя базы для вытворчасці фасфатных і калійных угнаенняў. Дзесяткі мільёнаў кубічных метраў прэснай падземнай вады новых месцанараджэнняў будуць паступаць для арашэння зямлі. Значна пашырацца работы па вывучэнню глыбіннай будовы зямной кары пры дапамозе бурэння звышглыбокіх свідравін, даследавання на шэльфах мораў і ў сусветным акіяне.

Гэтыя задачы патрабуюць паскарэння навукова-тэхнічнага прагрэсу, павышэння якасці і эфектыўнасці геолагаразведачных работ, што немагчыма без удасканальвання падрыхтоўкі маладых спецыялістаў-гідрагеолагаў і геафізікаў. Прывяду два прыклады, каб паказаць неабходнасць паляпшэння вучэбнага працэсу і перабудовы псіхалогіі як студэнтаў, так і выкладчыкаў. Міністэрства геалогіі СССР укараняе, пачынаючы з бягучага года, камп'ютэрную сістэму «Рэгіён», а з 1989 г. — прынцыпова новую аўтаматызаваную сістэму апрацоўкі вынікаў геафізічных даследаванняў «Палдік». Геалагічны факультэт павінен інтэнсіфіцыраваць выкарыстанне ЭВМ у вучэбным працэсе, а імавернастатыстычныя і карэляцыйныя метады апрацоўкі інфармацыі ўкараняць ужо на малодшых курсах. У той жа час трэба памятаць, што інфармацыя не толькі апрацоўваецца, але і здабываецца ў тайзе, у стэпе бурэннем, адкачкамі, прымяненнем геафізічных метадаў пошукаў і разведкі. Значыць, студэнты павінны ў дасканаласці авалодваць гэтымі метадамі і імкнуцца стаць сапраўднымі рудазнаўцамі. Умовы для гэтага ёсць. Патрэбна яшчэ адказнасць, мэтанакіраванасць студэнтаў — будучых геолагаў.

**М. ЖУРАВЕЛЬ,**
**дацэнт кафедры інжынернай геалогіі і гідрагеалогіі.**

*Да вынікаў конкурсу*

## ДЫПЛОМЫ — ПЕРАМОЖЦАМ

Значнай падзеяй у жыцці студэнцкай моладзі стаў праводзімы ў 1985—86 гг. XI Усесаюзны агляд-конкурс студэнцкіх работ па грамадскіх навуках, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху.

Летась, у год 40-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, прайшлі ўнутрывузаўскія і абласныя туры гэтага агляду-конкурсу. Сёлета ў студзені-лютым адбыўся рэспубліканскі тур. Ад нашага універсітэта на яго было накіравана 11 лепшых студэнцкіх даследаванняў. Яго вынікі паказалі новы якасны ўзровень студэнцкай навукі. Чатыры навуковыя працы студэнтаў ГДУ аднесены да I катэгорыі і ўдастоены Дыпломаў I ступені Мінвуза БССР. 5 работ атрымалі II катэгорыю і адзначаны Дыпломамі II ступені.

Лаўрэатамі рэспубліканскага тура XI Усесаюзнага агляду-конкурсу студэнцкіх работ ад нашага універсітэта сталі: чацвёртакурснік гісторыка-філалагічнага факультэта Ю. Аляксейчанка (навуковы кіраўнік — дацэнт А. П. Касьяненка), студэнт 2-га курса эканамічнага факультэта А. Цыбін (дацэнт А. І. Канашэвіч), чацвёртакурсніцы гэтага ж факультэта Т. Бурак (дацэнт Н. П. Пухава) і Т. Цэрахава (дацэнт У. Ф. Бондараў). Названыя студэнты ўзнагароджаны Дыпломамі I ступені Мінвуза БССР, а іх навуковым кіраўнікам аб'яўлена падзяка міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР. Дыпломамі II ступені ўзнагароджаны студэнты гісторыка-філалагічнага факультэта А. Бацян, С. Лысенка, І. Эсмантовіч, эканамічнага — А. Землякоў, У. Соя, біялагічнага — В. Гайдук.

28-га сакавіка ў Беларускім тэхналагічным інстытуце імя С. М. Кірава па выніках III тура XI Усесаюзнага агляду-конкурсу студэнцкіх работ адбылася рэспубліканская студэнцкая навуковая канферэнцыя «Творчасць маладых — XXVII з'езду КПСС». На яе былі запрошаны лаўрэаты рэспубліканскага тура конкурсу і іх навуковыя кіраўнікі. На пасяджэнні секцыі палітэканоміі выступілі Т. Цэрахава і А. Цыбін, секцыі навуковага камунізму — Ю. Аляксейчанка.

Віншуем пераможцаў рэспубліканскага тура XI Усесаюзнага агляду-конкурсу студэнцкіх работ і жадаем ім новых творчых поспехаў!

**І. ЭСМАНТОВІЧ,**
**старшыня Гомельскага абласнога аргкамітэта XI Усесаюзнага агляду-конкурсу студэнцкіх работ, дацэнт.**
**У. БОНДАРАЎ,**
**загадчык кафедры палітэканоміі, дацэнт.**

## ПАЛІТДЗЕНЬ НА ФАКУЛЬТЭЦЕ

Праводзімыя цяпер ва ўсіх калектывах адзіныя палітдні прадугледжваюць шырокую прапаганду матэрыялаў і рашэнняў XXVII з'езда КПСС, актыўную мабілізацыю працоўных на паспяховае ажыццяўленне вызначаных ім планаў і задач на новы перыяд камуністычнага будаўніцтва. На мінулым тыдні ў чацвер у рамках адзінага палітдня адбылася сустрэча кіруючых работнікаў універсітэта з выкладчыкамі, супрацоўнікамі і студэнтамі гісторыка-філалагічнага факультэта. Перад шырокай аўдыторыяй выступалі прарэктар па вучэбнай рабоце, член-карэспандэнт АН БССР, дэпутат гарадскога Савета народных дэпутатаў Л. А. Шамяткоў, сакратар парткома М. І. Старавойтаў, старшыня прафсаюзнага камітэта М. Н. Мурашка. Ім было зададзена шмат пытанняў, якія датычыліся далейшага павышэння якасці падрыхтоўкі маладых спецыялістаў, пашырэння навуковых распрацовак і больш эфектыўнага ўкаранення іх вынікаў у народную гаспадарку, маючай адбыцца перабудовы вышэйшай школы, перспектыў развіцця і ўмацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы ГДУ, іншых бакоў універсітэцкага жыцця. На пастаўленыя пытанні былі дадзены вычарпальныя адказы.

(Наш кар.)

## ПАВЕДАМЛЕННІ

**11-га красавіка ў актавай зале адбудзецца адкрыты агульнауніверсітэцкі партыйны сход.**

На парадак дня выносіцца пытанне: «Аб выніках работы XXVII з'езда КПСС і задачах партыйнай арганізацыі універсітэта, вынікаючых з яго рашэнняў». (Дакладчык — сакратар парткома М. І. Старавойтаў).

Пачатак сходу ў 14 гадзін 30 мінут, рэгістрацыя — з 14 гадзін.

ПАРТКОМ.

**11-га красавіка ў малой зале Дома палітасветы АК КПБ адбудзецца пленум праўлення Гомельскай абласной арганізацыі таварыства «Веды».** На парадак дня выносіцца пытанне: «Задачы арганізацыі таварыства «Веды» па прапагандзе матэрыялаў і рашэнняў XXVII з'езда КПСС».

Пачатак пленума ў 11 гадзін.

## ВІНШУЕМ!

Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат гісторыка-філалагічнага факультэта, кафедра беларускай мовы горача віншуюць асістэнта ПАЎЛАЎЦА Дзмітрыя Дзмітрыевіча з зацвярджэннем яго ВАКам у вучонай ступені кандыдата філалагічных навук.

* * *

Рэктарат, партком, кафедры беларускай і рускай літаратур горача віншуюць выпускніка аспірантуры ГДУ, дырэктара Гомельскага педагагічнага вучылішча ВОІНАВА Мікалая Мікалаевіча з выпадку паспяховай абароны дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук.

*На шляху школьнай рэформы*

## ПЕДАГАГІЧНЫ ВОПЫТ — МАЛАДЫМ

30—31 сакавіка Гомельскі дзяржаўны універсітэт сумесна з абласным аддзелам народнай асветы, абласным Саветам педагагічнага таварыства БССР, абласным інстытутам удасканальвання настаўнікаў правёў трэцюю па ліку абласную навукова-практычную канферэнцыю настаўнікаў-стажораў «Актуальныя праблемы фарміравання і ўдасканальвання педагагічнага майстэрства».

Каля 100 маладых настаўнікаў Гомельшчыны, выпускнікоў ВНУ 1985 г. прынялі ўдзел у абмеркаванні пытанняў навучання і выхавання школьнікаў у святле рашэнняў XXVII з'езда КПСС і школьнай рэформы.

Уступным словам канферэнцыю адкрыў прарэктар ГДУ па вучэбнай рабоце член-карэспандэнт АН БССР Л. А. Шамяткоў. Ён жа выступіў з дакладам аб задачах вышэйшых навучальных устаноў па ўдасканальванню якасці падрыхтоўкі спецыялістаў у святле рашэнняў XXVII з'езда КПСС.

На пленарным пасяджэнні канферэнцыі заслуханы таксама даклады дырэктара абласнога інстытута ўдасканальвання настаўнікаў Л. Я. Зарэцкай «Аб задачах педагагічных калектываў вобласці па выкананню рашэнняў XXVII з'езда КПСС і школьнай рэформы», дацэнта кафедры педагогікі і псіхалогіі ГДУ Ф. У. Кадола — «Псіхолага-педагагічныя асновы павышэння якасці ўрочных заняткаў у святле школьнай рэформы», прарэктара ГДУ па завочнаму навучанню, кандыдата педагагічных навук Л. Н. Сечкі — «Фарміраванне камуністычнага светапогляду як важнейшая задача камуністычнага выхавання вучняў у святле рашэнняў XXVII з'езда КПСС», заслужанай настаўніцы БССР, выкладчыцы гісторыі СШ № 28 г. Гомеля І. Л. Ведзяняевай «Педагагічнае майстэрства і шляхі яго фарміравання».

Затым маладыя педагогі абмяняліся вопытам стажорскай практыкі.

Пасля пленарнага пасяджэння канферэнцыя працягвала работу па секцыях — класнага кіраўніка, настаўнікаў гісторыі і грамадазнаўства, рускай мовы і літаратуры, беларускай мовы і літаратуры, матэматыкі, фізікі, хіміі і біялогіі, фізічнага выхавання, замежных моў, геаграфіі. Заслухана і абмеркавана каля 80 дакладаў. У іх падрыхтоўцы прынялі ўдзел многія вядучыя вучоныя і выкладчыкі педагагічных кафедр універсітэта, настаўнікі-метадысты сярэдніх школ, работнікі абласнога інстытута ўдасканальвання настаўнікаў і інш.

Канферэнцыя адыграе важную ролю ў далейшым удасканальванні стажорскай практыкі маладых настаўнікаў і павышэнні іх педагагічнага майстэрства, у больш паспяховым ажыццяўленні школьнай рэформы. Правядзенню канферэнцыі на высокім арганізацыйным узроўні садзейнічала плённая праца старшынь саветаў па прафарыентацыі і стажорскай практыцы М. П. Казакова з фізічнага, У. В. Арлова — з матэматычнага, А. Я. Малахавай — з біялагічнага, Г. А. Аляксейчанкі — з гісторыка-філалагічнага факультэтаў, а таксама старшай выкладчыцы кафедры нямецкай і французскай моў М. Ф. Рудзінскай, дацэнтаў факультэта фізвыхавання У. А. Баркова і С. П. Сямёнава.

Да канферэнцыі выдадзены і распаўсюджаны тэзісы дакладаў і выступленняў яе ўдзельнікаў.

**В. СЕЛІВАНАЎ,**
дэкан факультэта прафарыентацыі і стажорскай практыкі ГДУ на грамадскіх пачатках.

**РАШЭННІ XXVII З'ЕЗДА КПСС — У ЖЫЦЦЁ!**

## ПРАВЕРКА ІДЭЙНАЙ ЗАГАРТОЎКІ

*Да некаторых вынікаў палітзаліку*

**Па рашэнню камітэта камсамола ГДУ ў 1983 годзе для студэнтаў універсітэта быў уведзены палітычны залік. Сваёй мэтай ён ставіць пашырэнне палітычнага кругагляду будучых маладых спецыялістаў. І сёлета палітзалік адбыўся на ўсіх факультэтах. У яго праграму ўвайшлі пытанні па матэрыялах XXVII з'езда КПСС, міжнароднага жыцця, знешняй і ўнутранай палітыкі КПСС і Савецкага ўрада.**

**У цэлым палітзалік прайшоў на добрым ідэйным і палітычным узроўні. Сёння можна падвесці некаторыя яго вынікі.**

**З вялікай адказнасцю аднесліся да палітзаліку на матэматычным факультэце. У састаў камісій тут увайшлі члены партыйнага і камсамольскага бюро, куратары акадэмічных груп. Пытанні былі самымі разнастайнымі. Гэта дазволіла аб'ектыўна вызначыць узровень ведаў студэнтаў. Аб прынцыповасці падыходу да заліку сведчыць і той факт, што не ўсе студэнты, якія здавалі яго, былі атэставаны станоўча.**

**Нядрэнна прайшоў палітзалік на фізічным факультэце. З лепшага боку хочацца адзначыць групы Ф-11, Ф-12, Ф-22, Ф-34, Ф-36. Сходы ў гэтых групах праходзілі ажыўлена, зацікаўлена. Гэта можа паслужыць прыкладам для студэнтаў чацвёртага курса, якія да важнага мерапрыемства аднесліся не зусім сур'ёзна. У прыватнасці, у гр. Ф-44 палітзалік быў перанесены на іншы час па прычыне непадрыхтаванасці да яго студэнтаў.**

**Добрыя веды на палітзаліку паказалі студэнты гісторыка-філалагічнага факультэта. Так, у групе БР-11 (куратар В. Е. Громава) усе першакурснікі далі вычарпальныя адказы на пастаўленыя пытанні.**

**У заключэнне трэба адзначыць, што на належным узроўні палітзалік прайшоў там, дзе ў камісіі па яго прыёму ўвайшлі адказныя, прынцыповыя таварышы. У гэтых групах ён дазволіў не толькі высветліць глыбіню ведаў студэнтаў, але і дапамог ім разабрацца ў многіх пытаннях палітычнага жыцця краіны, у міжнародных падзеях.**

**А. ДЗЕМІДЗЕНКА,**
**намеснік сакратара камітэта ЛКСМБ па ідэалагічнай рабоце.**



**На палітзаліку акадэмічных груп запрашаліся ветэраны партыі і камсамола, удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, былыя падпольшчыкі і партызаны, прадстаўнікі рэктарата, парткома, грамадскіх арганізацый, выкладчыкі.**

**Студэнтам групы Г-41 гісторыка-філалагічнага факультэта цікава было сустрэцца з дацэнтам кафедры педагогікі і псіхалогіі М. А. Дзмітрыевым. Чалавек з 50-гадовым працоўным стажам, усё свядомае жыццё якога звязана з асноўным з навучаннем і выхаваннем падрастаючага пакалення, мае цікавую біяграфію. Міхаіл Афанасьевіч — актыўны ўдзельнік партызанскага руху, аўтар кнігі ўспамінаў «Ля ціхай Серабранкі», за плённую педагагічную і грамадскую дзейнасць удастоены высокага звання Героя Сацыялістычнай Працы.**

**Фота Н. Кір'янавай.**

*Па слядах нашых выступленняў*

## НЕДАХОПЫ ЎХІЛЯЮЦЦА

**Як паведамлялася ў газеце «Гомельскі універсітэт», 19-га сакавіка партком універсітэта заслухаў справаздачу дэканата, партыйнага, камсамольскага і прафсаюзных бюро фізічнага факультэта па выкананню пастановы ЦК КПСС «Аб мерах па пераадоленню п'янства і алкагалізму». Праводзімая ў гэтым напрамку работа прызнана неэфектыўнай.**

**На змешчаную публікацыю рэдакцыя атрымала адказ сакратара партбюро фізічнага факультэта Т. П. Жалонкінай. У ім гаворыцца: «На пасяджэнні партыйнага бюро вызначан рад мерапрыемстваў па ўхіленню адзначаных у пастанове парткома недахопаў і паляпшэнню на факультэце выхаваўчай работы. Зацверджаны рэгламент работы дэканата, кафедр. У групах праведзены сходы студэнтаў з мэтай больш актыўнага іх уступлення ў добраахвотнае таварыства барацьбы за цвярозасць.**

**Дацэнту кафедры гісторыі КПСС камуністу Э. М. Энціну даручана аказаць дапамогу слухачам школы маладога лектара пры падрыхтоўцы цыкла лекцый па тэматыцы XXVII з'езда КПСС. Складзены канкрэтны план лекцый па фундаментальных і прыкладных даследаваннях у галіне фізікі, з якімі члены таварыства «Веды» будуць выступаць у працоўных калектывах.**

**Дэканат, партбюро правялі метадычны семінар куратараў акадэмічных груп, на якім разгледжаны пытанні паляпшэння вучэбна-выхаваўчай работы, правядзення палітзаняткаў па вывучэнню матэрыялаў XXVII з'езда КПСС, аб паспяховай камплектацыі студэнцкіх будаўнічых атрадаў.**

**У прайшоўшым на факультэце палітычным заліку прынялі ўдзел работнікі дэканата, загадчыкі кафедр, члены партыйнага бюро.**

**У бліжэйшыя дні на факультэце адбудзецца агульны камсамольскі сход, на якім будуць абмеркаваны задачы камсамольскай арганізацыі, вынікаючыя з рашэнняў XXVII з'езда КПСС.**

**З боку дэканата і партбюро факультэта ўзмоцнен кантроль за ажыццяўленнем усёй выхаваўчай работы.»**

*Рашэнні XXVII з'езда КПСС — кіраўніцтва да дзеяння!*

# Прыкладная тэматыка

## дакладаў, лекцый і гутарак па выніках XXVII з'езда КПСС

XXVII з'езд КПСС — з'езд стратэгічных рашэнняў на крутым пераломе ў жыцці краіны, сучаснага свету ў цэлым.

Наватарскі характар Палітычнага даклада ЦК КПСС XXVII з'езду партыі. Тэарэтычнае значэнне рашэнняў XXVII з'езда КПСС.

Работа, урокі і вынікі XXVII з'езда КПСС — развіццё ленінскіх традыцый партыі, увасабленне партыйнай прынцыповасці і бальшавіцкай праўды.

Актуальныя праблемы марксісцка-ленінскай філасофіі, палітэканоміі і навуковага камунізму ў святле рашэнняў XXVII з'езда КПСС.

Паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, умацаванне міру на зямлі — генеральная лінія XXVII з'езда КПСС

Роля і значэнне курсу красавіцкага Пленума ў распрацоўцы генеральнай лініі партыі.

Новая рэдакцыя Праграмы КПСС — праграма планамернага і ўсебаковага ўдасканалення сацыялізму, далейшага руху да камунізму на аснове паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны.

Дыялектыка прадукцыйных сіл і вытворчых адносін ва ўмовах сацыялізму.

Радасныя пераўтварэнні ва ўсіх сферах жыцця, дасягненне якасна новага стану савецкага грамадства — задача гістарычнага маштабу.

Асноўныя напрамкі эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1986—1990 гады і на перыяд да 2000 года.

Круты паварот да інтэнсіфікацыі вытворчасці, павышэння якасці і эфектыўнасці — стратэгічная ўстаноўка КПСС.

Кардынальнае паскарэнне навукова-тэхнічнага прагрэсу, рэканструкцыя народнай гаспадаркі — галоўны рычаг павышэння эфектыўнасці вытворчасці.

Навука і паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны.

Аб шляхах дасягнення вышэйшага сусветнага ўзроўню прадукцыйнасці працы.

Галоўныя напрамкі ўдасканалення структурнай і інвестыцыйнай палітыкі.

Паскарэнне тэмпаў росту машынабудавання — аснова навукова-тэхнічнага прагрэсу ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі.

Якасць прадукцыі — на ўзровень лепшых айчынных і сусветных дасягненняў.

Вырашэнне харчовай праблемы — першачарговая задача.

XXVII з'езд КПСС аб творчым выкарыстанні ленінскай ідэі аб харчпадатку прымяняльна да сучасных умоў.

Асноўныя напрамкі рэформы гаспадарчага механізма, стварэння цэласнай, эфектыўнай і гібкай сістэмы кіравання.

Задачы і асаблівасці XII пяцігодкі.

Прывесці ў дзеянне ўсе рэзервы народнай гаспадаркі.

Дасягненне поўнага дабрабыту і свабоднага, усебаковага развіцця ўсіх членаў грамадства — праграмная мэта КПСС.

XXVII з'езд КПСС аб актыўнай, моцнай, цэласнай сацыяльнай палітыцы партыі, рашучым павароце да сацыяльна-культурнай сферы.

Удасканаленне сацыяльна-класавых і нацыянальных адносін.

Сацыялізм — жывая творчасць народа. Рашаючая роля чалавечага фактару.

Сацыяльная справядлівасць — важнейшая ўмова адзінства народа, палітычнай устойлівасці і дынамізму развіцця грамадства.

XXVII з'езд КПСС аб неабходнасці ўзмацнення кантролю за мерай працы і мерай спажывання, барацьбы з непрацоўнымі даходамі.

Паглыбленне сацыялістычнага самакіравання народа — стратэгічная лінія развіцця палітычнай сістэмы савецкага грамадства.

КПСС — вядучая сіла і галоўны гарант развіцця сацыялістычнага самакіравання, вышэйшая форма грамадска-палітычнай самакіруемай арганізацыі.

XXVII з'езд КПСС аб далейшым узрастанні ролі Саветаў народных дэпутатаў, узмацненні іх актыўнасці, самастойнасці і адказнасці.

Удасканаленне работы дзяржаўнага апарату, усіх органаў кіравання, выкараненне ведамаснасці, месніцтва, бюракратызму — справа вялікай важнасці.

Эфектыўнае выкарыстанне ўсіх форм непасрэднай дэмакратыі, прамы ўдзел народных мас у выпрацоўцы, прыняцці і выкананні рашэнняў — праграмная ўстаноўка партыі.

Сацыяльныя, палітычныя і асабістыя правы і свабоды савецкага чалавека.

Расшырэнне публічнасці ў дзейнасці партыйных, дзяржаўных і гаспадарчых органаў —

